# ПАД КРЫЛАМІ НАМІТКІ

аж празрыстыя! Традыцыя ткацтва знікала ўжо на пачатку XX стагоддзя. І этнографы спахапіліся: трэба гэта збіраць. А раней — набыў збіральнік намітку і піша: «завивается, как обычно».

***— Значыць, з прабабулінага чапца пачалося ваша захапленне народнымі жаночымі галаўнымі ўборамі?***

— Фактычна так. А вось гэты строй я аднавіла па фотаздымку, зробленым у 1903 годзе ў Рагачоўскім павеце ў вёсцы Шапчыцы. Адзін фотаздымак кабеты ў строі быў у профіль, другі ў фас. Я выпадкова трапіла на гэты самадзейны альбом, аўтар фотаздымкаў быў на той час студэнтам Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, родам з Магілёва, Вячаслаў Калістратавіч Костка. Ён дапамагаў Рускаму музею збіраць прадметы этнаграфіі, у тым ліку фатаграфаваў. Пад фотаздымкам бабулі ў намітцы яго подпіс чарнілам «Жанчына з вёскі Шапчыцы. Галаўны ўбор завівае толькі па святах і будзе пахаваная ў ім». Перагортваем старонку — тая ж бабуля, але па-другому завязаная намітка. «Жанчына з вёскі Шапчыцы ў намітцы, завітай па-званецку». І ў дужках: «Званец — вёска ў чатырох вярстах ад Шапчыц». Разумееце, чатыры вярсты — і ўжо іншы спосаб завівання. Потым захацелася даведацца, што ж там быў за строй — здымак жа чорна-белы. І мы паехалі ў Рагачоўскі музей. Там зафіксавалі такія ж, як на здымку, гарсэцік, андарак, фартух і сарочку, і аднавілі цалкам строй. Тут вельмі цікавы спосаб нашэння наміткі: яна ўтварае крыж на патыліцы.

***— Гэта таксама як абярэг?***

— Так.

***— Але насілі толькі на святы...***

— Але і ў будні дні замужняя жанчына не павінна была выходзіць нават да калодзежа з непакрытай галавой. Я чытала, як старыя абураліся: «Раней і да калодзежа без наміткі не выходзілі, а цяпер і ў царкву ў хустках ідуць». Намітка — убор традыцыйны для беларусак, ён сапраўды як абярэг, да таго ж статусны. Гэта быў як пашпарт — адразу бачна, адкуль гэтая жанчына, якое яе сямейнае становішча.

***— А хустка — гэта ўжо менш важнае?***

— Так. На Усходнім Палессі, праўда, любілі павязваць хустку, бо гэта была прэстыжная рэч, дарагая, купленая. Але яе павязвалі паверх наміткі.

***— Вы ж, напэўна, неаднойчы самі апраналі наміткі. Якія адчуванні, наколькі ў іх зручна?***

— Усе мадэлі, на якіх я завівала наміткі, казалі, што адчуваюць сябе прыгажэйшымі. Намітка мадэліруе твар. Што датычыцца практычнасці, то абараняе ад сонца, ад холаду. Паколькі захаваліся ў асноўным святочныя строі, то я рэканструявала варыянты завівання, якія адносяцца да іх. Але былі наміткі і для будняў — прасцейшыя, і спосабы завівання іншыя. Паводле двух фотаздымкаў Лебедзевай, зробленых у вёсцы Сарачы Любанскага раёна ў 1927 годзе, і па адным музейным прадмеце, што захоўваецца ў Расійскім этнаграфічным музеі, я рэканструявала тры спосабы нашэння адной наміткі. Там ёсць будзённы спосаб — калі канцы ўкладваюцца гэткай шапачкай, каб не перашкаджала ў працы і прыкрывала ўсе валасы.

## На кожнае царкоўнае свята — свая сарочка

***— Караткевіч абураўся, што за традыцыйную беларускую песню выдаецца песня кабацкая, прымітыўная, у той час як сапраўдная беларуская песня вельмі складаная, са шматгалоссем. Мне здаецца, і з народным касцюмам тая ж праблема...***



— Так. Успомніце, якія прымітыўныя сцэнічныя касцюмы да нядаўняга часу ў фальклорных ансамблях былі, такія ж і песні — «іх, ах» і падскокі... Я згодна з Караткевічам, што наша спадчына куды багацейшая — і мова мілагучная, і песні, і яны павінны гучаць у аўтэнтычных строях. Я ўдзячная спадарыні Рэгіне Гамзовіч, якая ў канцы XX стагоддзя выцягнула мяне на радыё і на тэлебачанне, дзе працавала, узяла ў якасці навуковага кансультанта ў свае паездкі. Яна адчула, што сапраўдныя галасы, сапраўдныя спевы павінны быць паказаны ў аўтэнтычных строях. У перадачах было і завіванне намітак. Вельмі спадзяюся, што гэтыя запісы захаваліся. Кожная дэталь мела значэнне... Вясельны спосаб завівання наміткі значыў, што род прымае гэту дзяўчыну да сябе. У поле яна, вядома, у такой намітцы не хадзіла.

***— Але і ў полі працавала ў намітцы, толькі ў іншай?***

— Так. На жаль, да нас не дайшлі тыя варыянты. Хоць, можа, самі наміткі і захаваліся — ёсць сярод іх вельмі простенькія.

***— Мне калісьці казалі, што самыя кепска захаваныя кнігі — буквары, падручнікі, таму што імі ўвесь час карыстаюцца. Мусіць, і з будзённым адзеннем так.***

— Вядома. Таму і мужчынскага народнага адзення мала захавалася. Таму што мужчынскае не так аздаблялася. Святочных сарочак было адна-дзве, а ў жанчын як мінімум дванаццаць. Мама казала — на кожнае царкоўнае свята свая сарочка.

***— А вось калі мы хадзілі на выставу ў Нацыянальным мастацкім музеі «Анталогія прыгажосці», заўважылі, што на манекенах з народнымі строямі мала ўпрыгожванняў. Нам сказалі супрацоўнікі, што падбіралі іх самі... Мала захавалася аўтэнтычных, ці іх не насілі?***

— Мала захавалася. Упрыгожванняў было багата. Насілі і пацеркі, і медальёны, і крыжыкі. На Усходнім Палессі насілі такія дробненькія пацеркі, як каўнерчык вакол шыі, а потым яшчэ і на ўсе грудзі — таму што гэта таксама дадатковы абярэг. У Давыд-Гарадоцкім строі ўсе грудзі былі завешаныя даволі буйнымі пацеркамі, і яшчэ быў адзін ці два крыжы. Архіўныя фотаздымкі сведчаць, што ні адна жанчына не хадзіла без пацерак.

***— А з чаго яны былі?***

— Каралавыя, бурштынавыя, шкляныя. У 1950-я ў Неглюбцы насілі шкляныя пацеркі, як на ёлку калісь чаплялі.

***— А бранзалеты насілі?***

— Бранзалеты ў археалагічных раскопках знаходзяць. Яны былі патрэбныя, каб на запясцях прытрымліваць рукаў. А потым манера заціскаць рукаў бранзалетамі мінула, перайшла ў дызайн адзення, рукаў пачалі сцягваць матузочкам.

***— А пярсцёнкі?***

— Былі. Адзін фартух да нас трапіў з двума заручальнымі пярсцёнкамі. Праўда, меднымі. Жанчына захавала фартух, у якім вянчалася, і тыя пярсцёнкі. Дарэчы, наміткі яшчэ выкарыстоўвалі як падарункі — на вяселле, на хрэсьбіны. Дарылі не толькі куме, але і куму — каб яму з той наміткі пашылі сарочку, кашулю, у якой бы ён хадзіў у храм.



У Лунінецкім раёне я нават бачыла пашытыя з намітак вясельныя штаны. Я ж адразу пазнаю намітачны арнамент, хай і на калашыне. Традыцыйнае адзенне перашывалася, перадавалася ў спадчыну. Напрыклад, па сарочцы можна прасачыць, хто яе насіў, як мянялася мода. Бачна, што калісьці прарэха была пасярэдзіне, каўнер адкладны. Так насілі яе ў XIX стагоддзі, потым з іншай карыстальніцай фасон змяніўся, замест простага разрэзу пасярэдзіне апынулася планка, і зашпілька аказалася збоку. Каўнер ужо не адкладны, а стаячы. Першы варыянт быў упрыгожаны тканым арнаментам, а тут крыжыкам малюсенькім чорна-чырвоным вышыта планка. Панасілі-панасілі тую сарочку, каўнер і манжэты абтрапаліся, фасон выйшаў з моды — замест ільняных манжэт паставілі паркалёвыя і вышылі паліхромным крыжыкам. Наша сарочка — яна ж універсальная, у яе няма памераў... Жанчына карміла грудзьмі — для гэтага доўгая прарэха спераду. Жанчына была стройная — падпярэзвалася паяском, фартушком.

***— Была ж і шарачковая шляхта, якая жыла практычна як мужыкі. Хату шляхціца пазнаеш, бо хата на два канцы, і на ганку калоны, хоць драўляныя... Як абазначалі гэтыя людзі свой статус у адзенні, нават у адсутнасці грошай?***

— Гаварылі мы з жанчынай з гэтай дробнай шляхты, якой споўнілася 120 гадоў. Яна жыла ў Мінску, а раней — у Бярэзінскім раёне. Яна распавяла, што толькі нешляхцянкі насілі ўпрыгожанае чырвоным адзенне, тыя ж сарочкі расшытыя. Шляхта такога не насіла. Апранала больш стрыманае па колерах і фасоне адзенне, але з дабротных тканін — шоўк, паркаль, шэрсць.

## Абрус на стале, ручнік на хлебе

***— А ці вы, славуты этнограф, у сваім побыце нейкія народныя традыцыі захоўваеце?***

— Мая мама казала, што ў беларуса ніколі абедзенны стол не будзе голы, ён абавязкова накрыты абрусам. І калі на ім ляжыць хлеб, ён таксама накрыты ручнічком. Калі мы жылі ў Карэла-Фінскай рэспубліцы, мама перавезла туды абраз — казала, у вайну ён выратаваў ад знішчэння сям'ю. На сцяне побач вісеў партрэт майго дзеда з чорнай акладзістай барадой. Дык калі немцы заходзілі ў хату, казалі на той партрэт: «Партызан, партызан». Нехта падказаў — схавайце партрэт за абраз, так і зрабілі. Дык вось, на кожнае свята мама вешала на той абраз вымыты, чысценькі ручнічок.

***— А як вы расшыфроўваеце арнаменты, якімі ўпрыгожвалі народнае адзенне?***

— Мне не падабаецца, калі дадумваюць тое, што страчана. Арнамент — гэта тэкст, які не мы пісалі. Мы можам толькі ў агульных рысах здагадвацца, што ён абазначае. На Неглюбскіх ручніках кожны радок арнаменту мае сваю назву, але яна была асацыятыўная. Напрыклад, «вераб'іная сцёжка», ці «калёсы», ці «яблыкі»... Гэта вельмі старажытная сімволіка, якая была страчана і перайшла ў чыста дэкаратыўныя формы. У народным адзенні сімволіка прысутнічае не толькі ў арнаменце. Напрыклад, у касцюме лелікаўскай свахі галаўны ўбор паверх наміткі ўпрыгожваўся стракатай павязкай са стужак і пацерак, якая называлася «брыжы». Пад брыжы па баках падтыкалі пукі пафарбаваных пер'еў — «пава», або «кокашы», што па форме нагадвала рожкі. Людзі жаніліся, каб працягваць род. Рогі — сімвал урадлівасці. Успомніце калядныя песні — «Дзе Каза рогам, там жыта стогам». Пер'і выкарыстоўвалі пеўняў, бо куры — таксама сімвал урадлівасці, плоднасці.

У вёсцы Запясочча, што недалёка ад Турава, адна бабулька распавядала, што калі ткалі наміткі, то мокрымі ачосамі льну бралі сажу з коміну і націралі ёй крайнія ніткі падрыхтаванай для ткання асновы. І беражкі наміткі атрымліваліся чорнымі. Бабулька не ведала, для чаго гэта, але памятала, што так трэба было рабіць. У мяне такія здагадкі: па-першае, сажавая кромка абазначала контур, графічна падкрэслівала галаўны ўбор. Па-другое, гэта ўбор замужняй жанчыны, яе жаночае месца — печ, комін. Націраючы яе намітку сажай з коміну, жанчыну бы прывярожваюць да сваёй хаты, да свайго коміну.

***— Я памятаю, як падчас выставы «Анталогія прыгажосці» наведнікі казалі, што гэта для іх — адкрыццё, што толькі цяпер яны зразумелі, хто такія беларусы.***

— Так, беларускі народны касцюм — гэта наш скарб; тое, што робіць нас адметнымі і распавядае пра нас і нам самім, і свету.

**Гутарыла Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**